©БГПУ

# ФОРМИРОВАНИЕ ПСИХОЛОГИЧЕСКОГО ЗДОРОВЬЯ ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА СРЕДСТВАМИ ХУДОЖЕСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

**А. С. МАТВЕЙЧИК**

**НАУЧНЫЙ РУКОВОДИТЕЛЬ – Е. П. ЧЕСНОКОВА, СТАРШИЙ ПРЕПОДАВАТЕЛЬ**

В статье представлены результаты исследования психологического здоровья детей старшего дошкольного возраста и возможностей его формирования средствами художественной деятельности.

Ключевые слова: психологическое здоровье, художественная деятельность, дети старшего дошкольного возраста, формирование психологического здоровья.

Современные дети нуждаются в укреплении их здоровья, в том числе психологического (В. А. Ананьев, И. В. Дубровина, О. В. Хухлаева и др.). Художественная деятельность обладает богатым потенциалом возможностей ее использования в качестве средства формирования психологического здоровья воспитанников в связи с близостью детей дошкольного возраста к художественному типу: характерным соотношением I и II сигнальных систем, чуткостью к образно-эмоциональным моментам, реактивностью на непосредственные впечатления, доставляемыми органами чувств, особым «эстетическим отношением к жизни» (А. В. Запорожец, В. Т. Кудрявцев, В. С. Мухина, Е. А. Панько и др.).

Исследование было нацелено на изучение психологического здоровья детей старшего дошкольного возраста и возможностей его формирования средствами художественной деятельности. На констатирующем этапе изучено психологическое здоровье воспитанников. Выявлено преоладание среднего уровня психологического здоровья. Общей чертой нарушений психологического здоровья воспитанников является выраженность таких симптомокомплексов, как неуверенность в себе, тревожность и трудности общения. Наиболее высокие показатели данных симптомокомплексов характерны мальчикам, что обусловлено их подверженностью негативным воздействиям стресса в связи с общественными стереотипами в воспитании: игнорированием потребности мальчиков в эмоциональной поддержке. Выявлено доминирование уровня оптимизма ниже среднего, что обусловлено влиянием образа мира, пессимистичных установок взрослых (родителей, педагогических работников) на восприятие действительности ребенком, а также характером телепередач, компьютерных игр, которые занимают в жизни детей немаловажное место.

На формирующем этапе исследования разработана и внедрена экспериментальная программа формирования психологического здоровья детей средствами художественной деятельности «Волшебная кисточка», представляющая собой систему психолого-педагогической поддержки всех субъектов образовательного процесса: воспитанников, их законных представителей и педагогических работников. Программа включила в себя комплекс занятий, направленных на решение образовательных, развивающих и воспитательных задач, предусмотренных Учебной программой дошкольного образования по образовательным областям «Ребенок и общество» и «Изобразительное искусство», а также нерегламентированную деятельность. Основными направлениями программы стали: содействие формированию у детей оптимизма, позитивного образа Я, повышение уровня позитивного самопринятия, формирование чувства защищенности, базового доверия к миру; содействие преодолению воспитанниками страхов, застенчивости, агрессивных тенденций поведения; приобщение детей к творчеству, формирование у них интереса к художественной деятельности, потребности в творческом самовыражении и др.

Проведенный качественный и количественный анализ результатов контрольного этапа эксперимента подтвердил целесообразность и эффективность использования программы «Волшебная кисточка» в формировании психологического здоровья воспитанников старшего дошкольного возраста и психологической культуры всех субъектов образовательного процесса.

©БДПУ

# ФАРМІРАВАННЕ Ў НАВУЧЭНЦАЎ 1–4 КЛАСАЎ МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ СРОДКАМІ ФАЛЬКЛОРУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

**Н. У. МУРАШКА**

**НАВУКОВЫ КІРАЎНІК – А. С. ШЫЛАВА, КАНДЫДАТ ПЕДАГАГІЧНЫХ НАВУК, ДАЦЭНТ**

Праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў, якія спрыяюць эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці, а таксама

фарміраванню вучэбнай дзейнасці ў навучэнцаў 1–4 класаў.

Ключавыя словы: маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, фальклор, адукацыйныя тэхналогіі.

**Уводзіны**

Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў сродкамі фальклору з'яўляецца актуальнай праблемай у сучаснай педагагічнай практыцы, таму што:

па першае, актуальнасць звароту да фальклору выцякае з філасофіі, дзе разглядаецца пытанне аб дыялогу культур;

па другое, у сувязі з мадэрнізацыяй адукацыйнага працэсу I ступені агульнай сярэдняй адукацыі на аснове кампетэнтнаснага падыходу ў навучальных праграмах вызначаны набор кампетэнцый. Аднак на сённяшні дзень у навуковай літаратуры недастаткова матэрыялу па іх фарміраванні;

па-трэццяе, праца з фальклорам дапамагае настаўнікам ажыццяўляць сваю дзеннасць у такіх накірунках, як патрыятычнае, полікультурнае, сямейнае і экалагічнае выхаванне.

**Тэарэтычныя асновы фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў сродкамі фальклору**

Кампетэнтнасны падыход адзначаны ў якасці асноўнага патрабавання да арганізацыі адукацыйнага працэссу ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, таму важнай задачай сучаснай школы з'яўляецца фарміраванне асноўных кампетэнцый у школьнікаў на ўсіх спупенях агульнай сярэдняй адукацыі. Для рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў навучальных праграмах I ступені агульнай сэрэдняй адукацыі па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Літаратурнае чытанне» для агульнаадукацыйных школ з рускай мовай навучання вызначаны набор адпаведных кампетэнцый, дзе адной з галоўных з'яўляецца маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя.

Валоданне культурай камунікацыі і зносін з'яўляецца паказчыкам культуры асобы ў цэлым. Асноўным сродкам камунікацыі з'яўляецца мова. Паколькі сучасныя беларусы жывуць ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму і асноўныя камунікатыўныя працэссы адбываюцца на рускай мове, то праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампэтэнцыі ў межах вучэбных дысцыплін «Беларускай мова» і «Літаратурнае чытанне» паўстае найбольш актуальна.

Пад «маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыяй» мы разумеем здольнасць і рэальную гатоўнасць да зносін адэкватна мэтам, сферам і сітуацыям зносін, гатоўнасць да маўленчага ўзаемадзеяння і разумення [1, с. 27]. Як адзначае А.А. Быстрова, маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя складаецца з ведаў аб лінгвістычных паняццях і камунікатыўных ўменняў.

Такім чынам, маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя ўяўляе сабой веды пра мову, як сістэму, маўленчую дзейнасць, камунікацыю і камунікатыўныя ўменні, а яе змест уключае валоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці; фарміраванне маўленчых паводзін, адэкватных мэтам і сітуацыям зносін; уменні выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў адпаведнасці з іх значэннем, выбіраць патрэбную моўную форму і спосабы выказвання думкі ў залежнасці ад умоў камунікацыі; развіццё вобразнага ўяўлення, маўленчай актыўнасці, здольнасці да літаратурнай творчасці на падставе ўспрынятых твораў мастацкай літаратуры; фарміраванне агульнавучэбных ўменняў працы з тэкставай інфармацыяй розных відаў [2].

Працэс фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў 1–4 класаў мае сваю спецыфіку [3; 4], і яго пасняховасць і эфектыўнасць залежаць ад уліку ўзроставых асаблівасцяў, характэрных для зносін у малодшым школьным узросце, выкарыстання відаў дзейнасці, характэрных для дадзенага перыяду, накіраванасці працы настаўніка на фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі і атмасферы, у якой адбываецца працэс яе фарміравання.

У сучаснай навуковай літаратуры прапануецца не разглядаць вучэбную дзейнасць як працэс набыцця ведаў, а зыходзіць з таго, што веды могуць быць дадатковым прадуктам гульні, адпачынку ці працы. Грунтуючыся на гэтай пазіцыі, мы згодныя з тым, што фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшым школьным ўзросце найбольш проста праходзіць у працэсе сюжэтна-ролевай гульні як найбольш дакладнай і даступнай мадэлі зносін. Вялікім патэнцыялам у гэтым плане валодаюць фальклорныя творы.

Каштоўнасць фальклору як педагагічнага сродку вызначаецца натуральным, беспрымусовым уздзеяннем на дзяцей, дзякуючы сродкам выразнасці; даступнасцю для дзяцей з розным узроўнем развіцця; стымуляваннем развіцця творчых здольнасцей асобы; эмацыянальна-эстэтычнай пераемнасцю паміж дарослымі і дзецьмі.

У педагагічным плане фальклорны матэрыял дае вялікія магчымасці. Фальклор заўсёды меў сувязь з жыццём, ён выхоўвае і развівае, даступны і зразумелы для навучэнцаў 1–4 класаў, а таксама

наглядны. Ён дае нам магчымасць выбару формаў работы: індывідуальныя, групавыя, калектыўныя. Творчая дзейнасць, якую прадугледжвае праца з фальклорным матэрыялам, дапамагае забяспечыць актыўнасць і свядомасць удзелу навучэнцаў у працэсе навучання, што абавязкова вядзе да трываласці вынікаў навучання.

Акрамя таго, у фальклорнай традыцыі няма падзелу на выканаўцаў і гледачоў таго ці іншага акта творчасці, а ўсе прысутныя з'яўляюцца яго ўдзельнікамі і стваральнікамі. Гэты працэс з'яўляецца вельмі істотным, паколькі здымаецца механізм ацэньвання, дзіця разнявольваецца, і сам працэс яго ўдзелу ў песні, танцы, гульні надзяляецца сэнсам.

Дзеці, спасцігаючы багатую мову фальклорных твораў, авалодваюць яе вобразнасцю, мілагучнасцю, прыгажосцю. Дзеці ўспрымаюць мастацкі твор і робяць яго нескладаны аналіз, завучваюць на памяць, узнаўляюць элементарную славесную творчасць. Вынікам такой дзейнасці з'яўляецца тое, што ў іх развіваецца слоўнікавы запас, граматычны бок маўлення, звязнае маналагічнае маўленне.

Такім чынам, маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя з'яўляецца складаным паняццем, якое адлюстроўвае здольнасць і рэальную гатоўнасць да зносін адэкватна мэтам і сітуацыям зносін, гатоўнасць да маўленчага ўзаемадзеяння. Паспяховасць і эфектыўнасць фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў залежыць ад уліку ўзроставых асаблівасцяў, ад выкарыстання спалучэння вучэбных і творчых відаў дзейнасці, ад атмасферы, у якой непасрэдна адбываецца працэс фарміравання. Фальклорны матэрыял дае нам патэнцыяльныя магчымасці ў рэалізацыі дадзеных задач, бо ён мае сувязь з жыццём, выконвае выхаваўчыя і развіваючыя функцыі, даступны, зразумелы і наглядны для навучэнцаў 1–4 класаў.

### Вопытна-эксперыментальная праца па фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання сродкамі фальклору

Намі была праведзена вопытна-эксперыментальная праца па фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання сродкамі фальклору. На канстатуючым этапе вопытна-эксперыментальнай працы мы вызначылі ўзровень сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў 1 класаў пры дапамозе распрацаванай намі методыкі вывучэння сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі [5].

Методыка вывучэння ўзроўню сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў уяўляе сабой вывучэнне ўзроўню сфарміраванасці слоўнікавага запасу, звязнага маўлення і камунікатыўных уменняў, у якой дыягностыка ўзроўню сфарміраванасці камунікатыўных уменняў створана на аснове методыкі М.А. Паваляевай [6].

Для вывучэння ўзроўню сфарміраванасці слоўнікавага запасу навучэнцам прапанавалі выканаць такія заданні, як: падзяліць прадметы на группы і падабарць да іх абагульняючыя словы (напрыклад, гародніна, садавіна, жывёлы, адзенне, посуд, мэбля), падабраць словы блізкія па значэнні, падабраць словы супрацьлеглыя па значэнні, падабраць азначэнні да прапанаванага слова. Для вывучэння ўзроўню сфарміраванасці звязнага маўлення вучням прапанавалася пераказаць невялікі па аб'ёме тэкст. Для вывучэння ўзроўню сфарміраванасці камунікатыўных уменняў у навучэнцаў 1–4 класаў мы выкарыстоўвалі назіранне за іх свабоднымі зносінамі.

Дыягностыка праводзілася на беларускай мове па ўсіх трох накірунках, вынікі па кожнаму з якіх заносіліся ў табліцу і вызначаўся агульны ўзровень сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

У дыягностыцы прымалі ўдзел два першых класа сярэдняй школы № 196 г. Мінска, кантрольная і эксперыментальная групы, з колькасцю вучняў 28 чалавек у кожным класе.

Вынікі дыягностыкі паказалі, што сфарміраванасць маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1 класаў пры карыстанні беларускай мовай знаходзіцца на нізкім узроўні, што паказвала на неабходнасць арганізацыі мэтанакіраванай працы па фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў.

З гэтай мэтай намі была распрацавана сістэма спецыяльнаарганізаваных мерапрыемстваў для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў школ з рускай мовай навучання і выхавання [7], якая ўключае ў сябе:

інтэнсіўнае выкарыстанне жанраў вуснай народнай творчасці, такіх як прыказкі і прымаўкі, скорагаворкі, загадкі, казкі, быліны, легенды і паданні на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання;

актыўнае выкарыстанне тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання і тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве, інтэрактыўных матадаў навучання;

выкарыстанне класных гадзін і пазакласных мерапрыемстваў, накіраваных на вывучэнне беларускіх фальклорных традыцый, у якасці спецыяльнастворaных умоў для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

На фарміруючым этапе вопытна-эксперыментальнай працы ў кантрольнай групе працягвалася навучанне па традыцыйнай методыцы, а ў эксперыментальнай групе праводзілася праца па фарміраванні маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на аснове распрацаванай намі сістэмы працы з фальклорнімі творамі.

Так навучэнцы эксперыментальнай групы, на момант напісанне даследвання, вывучалі фальклор на працягу 1–2 класаў, паколькі часавыя рамкі напісання працы не дазволілі нам правесці поўны 4-гадовы цыкл вопытна-эксперыментальнай працы. Спачатку вывучэнне адбываляся на ўроках беларускай мовы, а потом і на ўроках літаратурнага чытання з дапамогай інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій.

На ўроках беларускай мовы ў 1 класе, пад час засваення вуснага курсу, на этапе моўнай размінкі, актыўна выкарыстоўваліся скорагаворкі [8] для развіцця слоўнікавага запасу і правільнасці гукавымаўлення, і праводзілася праца па навучанню работы ў парах і групах па тэхналогіі калектыунага узаеманавучання.

У 2 класе падчас засваення вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Літаратурнае чытанне» навучэнцы працягвалі працаваць з творамі выснай народнай творчасці, такімі як прыказкі і прымаўкі [9], скорагаворкі, казкі па тэхналогіях калектыўнага ўзаеманавучання, навучання ў супрацоўніцтве [10] і пры дапамозе інтэрактыўных метадаў [11].

У якасці дадатковых умоў для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі мы прапанавалі правядзенне класных газін і пазакласных мерапрыемстваў, накіраванных на вывучэнне беларускіх народных святаў, такіх як Каляды [12], Масленіца [13], Вялікдзень [14], Купалле[15], Багач [16], арганізацыя якіх дазваляе стварыць натуральнае беларускамоўнае камунікатыўнае ассяродзе у сучасным адукацыйным працэсе.

З мэтай вызначэння эфектыўнасці распрацаванай намі сістэмы на кантрольным этапе вопытна-эксперыментальнай працы была праведзена дыягностыка сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі з навучэнцамі другіх класаў. Аналіз якой паказаў, што і ў кантрольнай, і ў эксперыментальнай групах назіраецца дынаміка росту сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў пры карыстанні беларускай мовай зносін.

Аднак больш дакладны вынік праведзенай працы даў нам параўналны аналіз па кожнаму з накіранкаў работы. Так, напрыклад, параўнальны аналіз сфарміраванасці камунікатыўных уменняў, які паказаў, што пры правядзенні паўторнай дыягностыкі 100 % навучэнцаў эксперыментальнай групы і толькі прыкладна 57 % навучэнцаў кантрольнай групы палепшылі свае вынікі.

Зрабіўшы аналіз праведзенай намі вопытна-эксперыментальнай працы, мы прыйшлі да высновы, што сістэма працы з фальклорнымі творамі па фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў, пабудаваная на выкарыстанні фальклору на ўроках беларусках мовы і літаратурнага чытання ў сукупнасці з інтэнсіўнымі адукацыйнымі тэхналогіямі і інтэрактыўнымі метадамі, а таксама з выкарыстаннем класных гадзін і пазакласных мерапрыемстваў у якасці дадатковых спецыяльнастворaных умоў, можа стаць адным з выніковых сродкаў фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Тэарытычная значнасць праведзенага намі даследвання заключаецца у тым, што зроблены аналіз існуючых тэарэтычных ўяўленняў аб маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, апісаны яе змест і структура, азначаны веды і ўменні, якія адносяцца да маўленча-камунікатыўнай кампетнцыі, вызначаны патэнцыял фальклору для яе фарміравання.

Практычная значнасць вынікаў даследвання ў тым, што распрацавана сістэма працы з фальклорнымі творамі па фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання, якая прадстаўляе магчымасці яе фарміравання ад простага да складанага і з улікам узроставых асаблівасцяў вучняў, паступовага павелічэння ступені выкарыстання беларускай мовы вучнямі ў сітуацыях зносін, максімальнага выкарыстання міжпрадметных сувязяў вучэбных прадметаў, вучэбных праграм па вучэбных прадметах для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай выхавання і навучання, сучаснага і народнага календара святаў.

Праведзеная намі вопытна-эксперементальная праца паказала станоўчую дынаміку ў фарміраванні маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–2 класаў і ў прыватнасці беларускага маўлення. Пацвердзілася выснова аб тым, што выкарыстанне фальклорных матэрыялаў у тандэме з інтэнсіўнымі адукацыйнымі тэхналогіямі і інтэрактыўнымі метадамі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання, а таксама з выкарыстаннем класных гадзін і пазакласных мерапрыемстваў у якасці дадатковых спецыяльнастворaных умоў дапамагае павысіць эфектыўнасць засваення матэрыялу, спрыяе развіццю слоўнікавага запасу, фарміраванню звязнага маўлення і камунікатыўных уменняў навучэнцаў, дае больш высокія станоўчыя вынікі, і дапамагае інтэнсіфікаваць працу настаўніка.

Падчас выкарыстання фальклорнага матэрыялу для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў, можна сутыкнуцца з пэўнымі цяжкасцямі ў працы:

падбор фальклорнага матэрыялу патрабуе пэўных часавых затрат, таму у дапамогу настаўнікам намі былі апублікаваны 12 артыкулаў, 10 мультымедыйных презентацый, 12 буклетаў для бацькоў і вучняў і раздатачны матэрыял, які азмешчаны ў вышейупамянутых крыніцах [5; 6; 7; 8; 9; 10; 11; 12; 13; 14; 15; 16] і ў электронных дадатках да іх;

большасць навучэнцаў разумее толькі невялікую колькасць слоў, мае вельмі бедны слоўнікавы запас;

негатыўнае стаўленне некаторых вучняў да беларускай мовы і, як вынік, адсутнасць матывацыі для яго вывучэння.

Аднак сістэматычнае і мэтанакіраванае выкарыстанне фальклорнага матэрыялу абавязкова прыводзіць да станоўчага выніку: у дзяцей фарміруюцца не толькі камунікатыўныя ўменні і беларускае маўленне, але выхоўваецца любоў да мовы і павага да культуры і традыцый свайго народа.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што інтэнсіўныя адукацыйныя тэхналогіі навучання могуць стаць адным з выніковых сродкаў фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў. А выкарыстанне фальклорнага матэрыялу падчас такой работы настаўнікамі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання, класных гадзінах і пазакласных мерапрыемстах дае вялікія творчыя магчымасці ў выбары інструментаў для арганізацыі дзейнасці навучэнцаў. Акрамя таго, фальклор развівае павагу да роднай мовы, культуры і традыцый беларускага народа, фарміруе каштоўнастныя адносіны да сям'і і прыроды.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Быстрова Е. А. [и др.]* Обучение русскому языку в школе : учеб. пособие для студентов пед. вузов / под ред. Е. А. Быстровой. 2-е изд., стер. М. : Дрофа, 2007.
2. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания : 2 класс / Министерство образования Респ. Беларусь. Минск : Нац. ин-т образования, 2017.
3. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Тэарэтычныя аспекты фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў 1–4 класаў // Пачатковая школа. 2021. № 11. С. 48–51.
4. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Спецыфіка фарміравання камунікатыўных уменняў у навучэнцаў 1–IV класаў // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. 2021. № 12. С. 3–7.
5. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Спецыфіка фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў 1–4 класаў сродкамі фальклору // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. 2020. № 4. С. 9–13.
6. *Поваляева М. А.* Справочник логопеда. Ростов н/Д. : Феникс, 2002.
7. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Фальклорныя традыцыі як педагагічныя ўмовы фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі // Актуальные проблемы искусства: история, теория, методика : материалы V Междунар. научн.-практ. конф., г. Минск, 11 ноября 2020 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол.: К. О. Успенский [и др.]. Минск : БГПУ, 2020. С. 247–250.
8. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Выкарыстанне інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій пры вывучэнні скарагаворак на ўроках беларускай мовы ў I класе // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. 2021. № 8. С. 31–34, 39–40.
9. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Эфектыўныя шляхі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз прыказкі і прымаўкі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. 2019. № 12. С. 7–12.
10. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў: урокі літаратурнага чытання ў II класе // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. 2021. № 4. С. 43–46.
11. *Мурашко, Н. В.* Использование интерактивных методов при работе с произведениями устного народного творчества на уроках литературного чтения // I Междунар. книжное издание стран Содружество Независимых Государств. Лучшие в образовании – 2021 : I Междунар. книжная коллекция науч.-педагогических работников. Нур-Султан, 2021. Т. X. С. 25–29.
12. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Фальклор як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў у пазакласнай дзейнасці // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. 2019. № 11. С. 59–65.

13. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Выхаванне і навучанне малодшых школьнікаў фальклорам: традыцыйнае народнае свята Маленіца // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. 2022. № 1. С. 64–68.
14. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Народныя традыцыі як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў у пазакласнай дзейнасці // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. 2020. № 3. С. 54–61.
15. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Выхаванне і навучанне фальклорам на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў сучаснай школе на прыкладзе традыцыйнага свята «Купалле» // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. 2020. № 5. С. 47–55.
16. *Мурашка Н. У., Шылава А. С.* Выхаванне і навучанне малодшых школьнікаў сродкамі фальклору на прыкладзе восеньскіх народных святаў // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. 2020. № 9. С. 63–68.

©РГСУ в г.Минске

# СОЦИАЛЬНО-ПСИХОЛОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ КАРЬЕРНОГО КОНСУЛЬТИРОВАНИЯ РУКОВОДИТЕЛЕЙ КОММЕРЧЕСКИХ ОРГАНИЗАЦИЙ С СИНДРОМОМ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО ВЫГОРАНИЯ

**А. П. НЕМКОВИЧ**

**НАУЧНЫЙ РУКОВОДИТЕЛЬ – Е. В. САМАЛЬ, КАНДИДАТ ПСИХОЛОГИЧЕСКИХ НАУК, ДОЦЕНТ**

В статье показано, что применение технологии карьерного консультирования в работе с синдромом профессионального выгорания без специальных техник (коучинговых), направленных на коррекцию профессионального выгорания, не является эффективным методом, но в работе с руководителями без признаков выгорания, карьерное консультирование позволяет быстро и качественно достичь карьерных целей.

Ключевые слова: синдром профессионального выгорания, руководители, коммерческие организации, карьерное консультирование.

К специфике работы руководителей коммерческих организаций на современном этапе развития общества можно отнести социально-экономическую нестабильность, высокую конкуренцию на рынке труда, умение быстро реагировать на изменяющиеся условия и принимать решения, от которых зависит судьба подчиненных и организации в целом, высокую интенсивность и напряженность работы. Однако далеко не каждый может адаптироваться к таким условиями и эффективно осуществлять свою профессиональную деятельность, что приводит к нарушению физического, психического и эмоционального состояния личности и становится причиной развития профессионального выгорания.

В результате проведенного формирующего эксперимента с 48 руководителями коммерческих организаций г. Минска (28 мужчин и 20 женщин), который состоял из первичной диагностики, повторной диагностики после применения карьерного консультирования, и последующей диагностики после применения комбинированной технологии карьерного консультирования и коучинга, были сделан вывод о том, что карьерное консультирование в чистом его виде, недостаточно эффективно с клиентами, находящимися в состоянии профессионального выгорания, однако разработанная и внедренная программа с применением комбинированных методов карьерного коучинга и консультирования показала свою высокую результативность. Таким образом, для достижения эффективности коррекции профессионального выгорания у руководителей коммерческих организаций, работа с ними должна быть, во-первых, основана на комплексной диагностике данного синдрома, во-вторых, дифференцирована в соответствии с выраженностью симптомов выгорания и социально-психологическими особенностями личности, в-третьих, направлена на формирование адаптивного поведения в сложных ситуациях профессионального взаимодействия. Также стоит отметить, что в сложившихся реалиях набирающего популярность карьерного консультирования возрастает число неквалифицированных услуг, когда не проводится первичная диагностика и не анализируются причины «застоя» клиента, а работа строится без учета индивидуальных особенностей личности, опираясь лишь на стандартные техники карьерного консультирования. Мы полагаем, что карьерный консультант обязан учитывать социально-психологические особенности личности, его эмоциональное и психологическое состояние и в случае, если он видит признаки профессионального выгорания, он должен либо перенаправить клиента к другому специалисту, либо корректировать свою работы с учетом выявленных факторов. Так, если руководитель не осознает причины своего состояния, не может сформулировать свою профессиональную цель, или не знает что делать и у него наблюдаются признаки профессионального выгорания, то необходимо сначала прибегнуть к помощи карьерного коучинга, чтобы разобраться в причинах и сформулировать свои карьерные цели, оценить пути их достижения, и лишь после этого обращаться к карьерному консультанту с конкретной сформулированной и осознанной целью.